лактики здоровья» среди учащихся средних общеобразовательных учреждений Республики Бурятия / М-во культуры Рос. Федерации, Союз охраны псих. здоровья, Вост.-Сиб. гос. ин-т культуры ; отв. ред. Е. Ю. Перова ; науч. ред.: И. С. Цыремпилова, Е. А. Кучмурукова ; редкол.: Л. А. Андреева [и др.]. – Улан-Удэ : ИПК ФГБОУ ВО ВСГИК, 2018. – 206, [1] с.

8. *Недвецкая, М. Н.* Управление качеством педагогического взаимодействия школы и семьи : автореф. дис. ... д-ра пед. наук : 13.00.01 / М. Н. Недвецкая // Моск. гуманит. пед. ин-т. – М., 2009. – 46 с.

9. *Олефир, С. В.* Педагогический потенциал текстов новой природы в развитии читательской деятельности школьников / С. В. Олефир, А. Н. Юлдашева, Д. Ф. Ильясов // Мир науки, культуры, образования. – 2018. – № 5 (72). – С. 52–54.

10. *Оморокова, М. И.* Совершенствование чтения младших школьников : метод. пособие для учителя / М. И. Оморокова. – 2-е изд., испр. и доп. – М., 2001. – 46 с.

11. Подросток цифрового поколения в контексте читательской деятельности (на примере Республики Бурятия) : монография / В. В. Кучмуруков, Е. А. Кучмурукова, Г. А. Шаньгинова, И. А. Фокичева ; науч. ред. И. С. Цыремпилова. – Улан-Удэ : Издательско-полиграфический комплекс ФГБОУ ВО ВСГИК, 2021. – 176 с.

12. *Ушинский, К. Д.* О первоначальном преподавании русского языка / К. Д. Ушинский // Избранные педагогические сочинения : в 6 т. – М. : Учпедгиз, 2004. – Т. 2. – 825 с.

УДК 745.5(476)Красічкава

**Р. Ф. Шаура,**

*доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ЖЫЦЦЁВЫ І ТВОРЧЫ ЛЁС КРАСІЧКАВАЙ АЛЕНЫ ІОСІФАЎНЫ

**Анатацыя.** Народнае выўленчае мастацтва Беларусі мае глыбокую гісторыю існавання і развіцця. У паслярэвалюцыйны час у Беларусі актыўна ствараліся студыі і гурткі самадзейнай мастацкай творчасці, ладзіліся творчыя выстаўкі. Рабочыя, значная частка інтэлігенцыі былі ўключаны ў сацыякультурны рух, які падтрымліваўся дзяржавай. З гісторыі вядомы шматлікія імёны кіраўнікоў і арганізатараў гэтага руху, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё народнай мастацкай культуры. Хацелася б узгадаць А. І. Красічкаву як вядомага чалавека ў беларускай культуры.

**Ключавыя словы:** самадзейнае мастацтва, аматарскія творчыя калектывы, сацыякультурны рух, народны жывапіс, дамы народных рамёстваў.

**R. Shaura,**
*Doctor of Art History, Professor, Head of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## THE LIFE AND CREATIVE FATE OF KRASICHKOVA ELENA IOSIFOVNA

**Abstract.** The folk art of Belarus has a deep history of existence and development. In the post-revolutionary period, studios and amateur art circles were actively created in Belarus, and creative exhibitions were constantly held. The workers, a significant part of the intelligentsia, and the Red Army were included in the socio-cultural movement, which was comprehensively and constantly supported by the state. Many names of the leaders and organizers of this movement, who made a significant contribution to the development of folk art culture, are known from history. I would like to recall the name of Krasichkova A. on this occasion, as a famous person in Belarusian culture, and talk about her life and creative forest in the heroic and difficult time of our country.
**Keywords**: amateur art, amateur creative teams, social and cultural movement, folk painting, Houses of folk crafts.

У 1970-я гг. развіццё народнага мастацтва знаходзілася на асобным уздыме. Не толькі на рэспубліканскім, але і на міжнародным узроўнях заявілі сябе беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное і аматарскае выяўленчае мастацтва. Спецыфіка аматарскага выяўленчага мастацтва заключаецца ў тым, што ў яго аснове развіцця ляжыць не толькі мастацка-творчая дамінанта як эстэтычная катэгорыя, але і сацыякультурны аспект, які аб’ядноўвае працэс дзейнасці разгалінаванай сеткі арганізацыйна-метадычных інстытутаў, вучэбна-выхаваўчых устаноў і адукацыйных структур [2]. Сацыякультурны бок народнай выяўленчай творчасці меў велізарнае значэнне ў мастацкай асвеце мас у другой палове ХХ ст., не меншую актуальнасць яна захоўвае і сёння. На сучасным этапе ў Беларусі разам з Саюзам майстроў народнай творчасці шмат Дамоў народных рамёстваў, цэнтраў эстэтычнага выхавання, абласных і раённых арганізацыйна-метадычных структур, якія забяспечваюць рознабаковую дзейнасць усёй сістэмы народнага мастацтва.

У пасляваенны перыяд ладзіліся абласныя, рэспубліканскія і ўсесаюзныя выстаўкі самадзейнай творчасці, арганізоўваліся спецыяльныя паездкі да мастакоў-аматараў і народных майстроў, ім аказвалася кансультацыйная дапамога з боку рэспубліканскіх арганізацыйна-метадычных устаноў – Міжсаюзнага Дома мастацкай самадзейнасці і Рэспубліканскага Дома народнай творчасці. Кансультанты выязджалі на месцы да народных майстроў. Добра наладжаная справа ў рэспубліцы мела станоўчы вынік. Для развіцця народнай мастацкай творчасці спраўна працавалі шматлікія дзяржаўныя арганізацыйныя структуры: Дамы рэспубліканскай і міжсаюзнай самадзейнай твор-

часці, зацікаўленыя і адданыя справе кіраўнікі і супрацоўнікі сацыякультурных устаноў. З гэтай нагоды хацелася б выдзеліць Алену Іосіфаўну Красічкаву, якая ўнесла важкі ўклад у станаўленне і развіццё народнага мастацтва ў Беларусі. Узгадаем кароткую жыццёвую і творчую біяграфію цікавага і своеасаблівага чалавека.

Пасля вайны Алена Іосіфаўна працавала ў розных дзяржаўных установах, аднак яе прафесійная дзейнасць заўсёды была звязана з творчасцю. Пэўны час працавала кіраўніком гуртка вышывальшчыц пры гарнізонным Доме афіцэраў, вядучым метадыстам Рэспубліканскага Дома народнай творчасці і Міжсаюзнага Дома мастацкай самадзейнасці. З яе непасрэднай дапамогай выяўлены сотні народных творцаў, – спецыялістаў у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, жывапісе, разьбе па дрэве, графіцы, якія праслаўлялі беларускую культуру на рэспубліканскім, усесаюзным і міжнародным узроўнях. Менавіта дзякуючы намаганням А. І. Красічкавай сусветную вядомасць у галіне народнай мастацкай творчасці атрымалі такія народныя творцы, як М. Засінец [1], В. Жарнасек, Л. Трахалёва, І. Супрунчык, Ф. Максімаў, Ф. Дудо, П. Гольцаў, І. Абравец, М. Папоў, Р. Колчын і іншыя.

Лёс і жыццё Алены Іосіфаўны – гэта гісторыя, напоўненая жорсткімі і суровымі выпрабаваннямі.

Нарадзілася Алена Іосіфаўна ў Барысаве, у сям'і рабочага. У падлеткавым узросце асірацела разам з меншымі сястрычкамі і братам. Бацьку забілі ў 1919 г. бандыты, а маці, якой споўнілася 27 год, памерла. На выхаванне ўсіх іх узяў дзядзька. Матэрыяльнае становішча вялікай сям'і было цяжкім. У першыя гады пасля рэвалюцыі ў краіне панавалі разруха і голад. Па ўспамінах Алены Іосіфаўны, з жалудовай мукі пяклі хлеб, які быў горкім як палын і каляным, але елі, каб не памерці з голаду. Летам было лягчэй: збіралі шчаўе, яблыкі, ягады. Даводзілася насіць паношаную вопратку не па памеры. Не было ні адзення, ні абутку. Не было дзе купіць, і сродкаў на гэта не было. Страшэнны пажар, які некалькі дзён бушаваў, знішчыў амаль што палову Барысава, у тым ліку хату і маёмасць дзядзькі, давялося для жылля ладзіць непрыстасаванае памяшканне. Бытавыя цяжкасці абвастрыліся да крайнасці. «Усе шукалі выхад з такога крызіснага стану, усяляк змагаліся за жыццё», – успамінала Алена Іосіфаўна. Памерлі дзве сястрычкі, засталіся малодшая сястра і брат. Алена вучылася ў школе і дапамагала дзядзьку па гаспадарцы. Скончыўшы 10 класаў, яна паступіла ў педагагічны тэхнікум. Пасля другога курса тэхнікума пайшла працаваць настаўніцай у пачатковую школу ў Пячах (пад Барысавым), потым у вёсцы Старынкі Лагойскага раёна. У 1924 г. пазнаёмілася са сваім будучым мужам, калі ён, камандзір артылерыйскага батальёна, нейкі час кватараваў у хаце дзядзькі – Нагорнага Андрэя Вікенцьевіча, а яна прыязджала з работы на выхад-

ны дзень дамоў. Пачалася Вялікая Айчынная вайна, праз пэўны час мужа нястала. У канцы 1943 г. Алена Іосіфаўна пераехала да сястры ў Намангам Узбекскай ССР, уладкавалася працаваць у картачнае бюро, падтрымлівала сувязь з братам і сынам Уладзімірам, які вучыўся ў паскораным ваенным вучылішчы і ў маі 1944 г. прыслаў маці тэлеграму з наступным тэкстам: «Дарагая мама. Скончыў вучылішча. Прысвоена званне лейтынанта. У хуткі час прыеду ў кароткатэрміновы водпуск да цябе. Цалую, твой сын Уладзімір». Слёзы радасці хлынулі з вачэй Алены Іосіфаўны, яна быццам зноў убачыла навакольны свет яркім і жыццесцвярджальным. Дзеля шчаслівай хвіліны ў жыцці варта прайсці праз пекла і нават смерць, каб зноў ускрэснуць і жыць. Шчасце маці было бязмерным, наперадзе дарагая сустрэча. Хутчэй бы час ішоў, несцярпіма чакаць, нават гадзіны, хвіліны.

На рабоце Алена Іосіфаўна добра і хутка адаптавалася. Вайна працягвалася. Час быў цяжкі. Працаваць даводзілася шмат, ведалі, што так патрэбна дзеля Перамогі. Ці ж можна было лічыцца з цяжкасцямі, доля вайны аднолькавая для ўсіх. Так і праходзілі дні 1944 г. Але ў адзін з дзён патэлефанавалі Алене Іосіфаўне з ваенкамата і запрасілі прыбыць да камісара. Гэты званок быў успрыняты як пацверджанне прыезду сына на часовую пабыўку.

Ваенны камісар сустрэў А. І. Красічкаву неяк стрымана, суха. На яго стале былі раскладзены дакументы, палкоўнік нешта запытваў, імкнуўся завесці гаворку, але погляд адводзіў. Сэрца Алены Іосіфаўны затрэслася, сігнал трывогі прарэзаў усё цела ад галавы да ног, пачуўшы словы палкоўніка: «Красічкаў Уладзімір Мікалаевіч загінуў пры вызваленні Магілёў-Падольскага». Жанчына ў непрытомнасці павалілася на падлогу. Цяпер ужо, здавалася, сэнс жыцця страчаны назаўсёды. Раней Алена Іосіфаўна верыла, што расце сын – яе апора, надзея, сэнс жыцця, яе адзіны шанец вярнуцца да нармальнага ладу існавання быў жорстка вырваны лёсам. Быццам разважала яна сама з сабой, усё ж проста жыць і працаваць дзеля іншых [3].

Прайшлі дзесяцігоддзі, загаіліся раны Вялікай Айчыннай вайны. Алена Іосіфаўна стала працаваць у розных выхаваўча-творчых установах у рэспубліцы, вяла актыўную работу з народнымі майстрамі і самадзейнымі мастакамі [4] і, дзякуючы яе намаганням, народная мастацкая культура змагла ўзняцца на высокую ступень, якая сёння з'яўляецца асновай дзяржаўнай культурнай палітыкі Беларусі.

За шматгадовую працу ў галіне народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў, а таксама за вялікі ўклад у нацыянальную культуру Беларусі ў 1984 г. Красічкава Алена Іосіфаўна ўзнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

---

1. *Шаура, Р. Ф.* Міхась Засінец / Р. Ф. Шаура [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1981. – 46 с.

2. *Шаура, Р. Ф.* Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі: жывапіс, графіка, скульптура / Р. Ф. Шаура. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 251 с.
3. *Шауро, Г.* Не поле перейти: документальная повесть о человеческих судьбах / Г. Шауро. – Минск : Кнігазбор, 2021. – 71 с.
4. Учимся вышивать / Е. И. Красичкова, Л. П. Дубовицкая. – Минск : Полымя, 1989. – 173 с.



Склад курсаў вышывальшчыц пры Доме афіцэраў Беларускай ваеннай акругі (першы рад, злева А. І. Красічкава). 1947 г.



А. І. Красічкава праводзіць кансультацыі па вышыўцы ў спецыялізаванай студыі пры гарнізонным Доме афіцэраў. 1948 г.



А. І. Красічкава каля магілы сына. г. Магілёў-Падольскі. 1944 г.



Склад арганізацыйнага і экспертнага савета Рэспубліканскай выстаўкі народнай творчасці (першы рад, другая злева А. І. Красічкава). г. Мінск. 1973 г.